Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłata pocztowa uiszczono ryczałtem.

ЗА ПРАЦУ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6). Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр., на 3 мес. — 4 зл., на паўгоду — 8 зл., на год — 15 зл., заграніцу ўдвая даражэй. Перамена адрасу 30 гр.

Непрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 1 Вільня, Панядзелак 5-га лістапада 1928 г. Год 1

Беларуская Акадэмія Навук.

У той час, калі ў нас, на абшарах Зах. Беларусі, над адзінай масавай культурна-асьветнай арганізацыяй вісіць „дамоклаў меч"—у гэты час, амаль незаметна, у некалькі радкоў прайшла заметка аб адчыненьні ў Менску Беларускай Акадэміі Навук.

Што гэта значыць? А значыць шмат, вельмі шмат. Гэта значыць, што культура беларуская пры іншых умовах, як у нас, ня толькі пасьпела, каб узгадоўваць беларускіх сялян і работнікаў *у сваіх школах*, *у сваіх* гімназіях—і іншых сярэдніх школах, *у сваіх* унівэрсытэтах, — яна дасьпела да таго, каб пачаць арганізованую навуковую працу, каб стаць нароўні з іншымі культурамі ў сэнсе дасьледжаньня і распрацоўкі ўсіх галінаў нашага матэрыяльнага і духовага жыцьця; дасьпела, каб ужо *сваімі сіламі* абслугоўваць ня толькі школьныя ўстановы ад ніжэйшых да вышэйшых, а арганізована надаваць тэмп самай беларускай навуцы, навуцы беларускіх сялян і работнікаў. Адчыненьне Беларускай Акадэміі Навук азначае, што дзесь нас запраўды лічаць „роўных з роўнымі, вольных з вольнымі", азначае, што мы не толькі маем права да сваіх пачатковых школ, ня толькі маем права, а *можам тварыць* сваю понадвышэйшую культурна-асьветную ўстанову, сваю Беларускую Акадэмію Навук!

У жыцьці беларускіх працоўных гушчаў факт адчыненьня Б. А. Н. мае бязумоўна эпохальнае значэньне, значэньне, якое народы заваёўваюць вякамі. Да дзьвюх існуючых Акадэміяў, Усесаюзнай і Украінскай, у СССР прыбывае, як раўнацэнны чыньнік Беларуская Акадэмія, цэлы навуковы сьвет узбагачаны новай установай найвышэйшага тыпу, якая бяз сумляваньня ўняса ў агульную скарбніцу сусьветнай навукі занядбаны дасюль, выпадковы для навукі куток—Беларусь; беларускія працоўныя гушчы здабылі сьветач свайго жыцьця, тлумача гэтага жыцьця між іншымі народамі.

Няма чаго й казаць, што ў Радавай Беларусі факт адчыненьня Беларускай Акадэміі Навук выклікаў проста энтузіям сярод, ня толькі культурных беларускіх працаўнікоў, а і палітычных працаўнікоў і то ня толькі беларускіх, а іншых, хто працуе на Беларусі. Газэты поўны артыкулаў, высьняючых паступовы пераход з Інстытуту Беларускай Культуры ў Акадэмію і значэньне самай Акадэміі ў беларускім жыцьці. Факт адчыненьня такія працаўнікі, як Некрашэвіч, Ластоўскі, Пічэта, беларускія паэты — лічаць вялікім сьвятам беларускай культуры — і шлюць Акадэміі свае гарачыя прывітаньні.

Сталыя канфіскаты сялянска-работніцкіх газэт не дазволілі нам дасюль належна ацаніць гэты важны факт у беларускім жыцьці. Але мусім дзівіцца, што наша ўгадовая (сельсаюзьніцка-кадэцкая) прэса, ня кажучы ўжо аб яўна здрадніцкай ад „Народаў" да „Днёў" уключна, ня хоча дасюль ацаніць гэтага важнага факту, хацяж бы са свайго нацыяналістычнага пункту гледжаньня. Калі навет пакінуць факт, што гэтая справа зроблена варожымі гэтым групам чыньнікамі, усё-ж ня можна ігнараваць яго з пункту важнасьці нацыянальнай, чым так любяць прыкрывацца нашыя ўгоднікі і прадажнікі для абаламучаньня масаў. Відаць, ім мілей, для іх даражэй свае рэклямныя, шыльдавыя крамкі, як „Інстытут Гаспадаркі і Культуры", „Гаспадарчыя Зьвязы", круцёлкі і т. п. нікому не патрэбныя міб ўстановы мілей, як—Белар. Акадэмія Навук. Яны ігнаруюць, яны замоўчваюць найважнейшы акт у духовым жыцьці беларускага народу, бо гэта сьведчыць, што навет тая галіна, якою яны прыкрываюцца ў сваей дзеяльнасьці, каб скрыць свае ўгодніцкія і прадажніцкія твары, гэтая галіна расьце і разьвіваецца бяз іх і проці іх волі, бо Акадэмія-ж будзе служыць бязумоўна работнікам і сялянам. Беларускія працоўныя гушчы Зах. Беларусі радасна прывітаюць гэты вялікі акт у беларускім культурным будаўніцтве, акт, які пазволіць ім з верай і надзеяй глядзець будучыне ў вочы, які тую трывогу, што мімаволі паўстала ў іх у зьвязку з няпэўным становішчам сваіх культурна-асьветных пляцовак у Зах. Беларусі, пазволіць рассеяць сьвядамасьцю, што аканчальна лёсу ўсяе культурна-асьветнае працы беларускага народу ўсё, што адбываецца—ані захістае, ані задзержыць.

Яна ідзе, яна творыць новыя скарбы, яна цэмэнтуе думкі беларускіх сялян і работнікаў, дае надзею ў аканчальнае вызваленьне, як сацыяльнае, гэтак і нацыянальнае. У гэтым упэўняе нас факт адчыненьня Беларускай Акадэміі Навук.

За кулісамі „нябывалага гаспадарчага росквіту" Амэрыкі.

Набліжаючыяся ў краі прэзыдэнцкія выбары, у часе якіх маюць суткнуцца паміж сабой, ня толькі дзьве найвялікшыя, амаль ня роўныя па сіле партыі—„рэспубліканцаў" і „дэмакратаў", рэпрэзэнтуючыя магутныя арміі краёвай буржуазіі—буйнейшай і драбнейшай, мястовай і вясковай (фэрмераў: пэўную ролю маюць адыграць і суадносна слабыя работніцкія партыйныя арганізацыі.

Як часта пішацца і гаворыцца, „у Амэрыцы няма работніцкага пытаньня", — „няма сацыялізму"... Няма — дзеля таго, што там быццам — „няма падставаў для іх паўстаньня", — „няма тэй беднаты, таго ўціску і вызыску, якія пануюць у Эўропе"...

Трэба дадаць толькі, што няма ўсяго гэтага афіцыяльна — няма таму, што амэрыканскі ўрад і пануючая ў краі неабмежавана буйная буржуазія не прызнаюць існаваньня ўсяго гэтага...

І вось, толькі цяпер — у часе надыходзячых выбараў — ня толькі робіцца больш чутны голас работніцкіх масаў, церпячых ад страшэннай бяды, але і самі канкуруючыя партыі буржуазіі неяк пачынаюць зьвяртаць увагу на гэты голас, пачынаюць прызнаваць існаваньне „работніцкага пытаньня" ў краі; закідаць адна аднэй віну ў жыцьцёвым занападзе работніцкіх масаў, прыкідваючыся—у мэтах здабыцьця работніцкіх галасоў—прыяцелямі і абаронцамі работніцкай клясы"...

Запраўды-ж, — не прайшло і году ад часу, калі былы міністар гандлю і прамысловасьці сучаснага ўраду, а цяпер кандыдат у прэзыдэнты з боку ўрадавай партыі „рэспубліканцаў", „муж даверыя" буйнейшай буржуазіі, ведамы Гувэр, апублікаваў свой „рэкордавы адчот" за 1927 г., у якім — у запраўды-ж задзіўляючых лічбах сьцьвердзіў „нябывалы фінансава - прамысловы ўздым краю".

А вось цяпер — у найпаважнейшых органах фінансава-гаспадарчай думкі амэрыканскай буржуазіі — усьцяж расьце трывога перад тэй „сьветлай будучыняй бязьмежнага росквіту", якую такімі вясёлкавымі фарбамі рысаваў п. Гувэр...

І тутака мы адразу спатыкаемся з тым самым „работніцкім пытаньнем", якое, ставячы сабе чыста тэхнічныя і фінансавыя задачы ўласнага збагачэньня і развбудовы прамысловасьці і не зважаючы на працаўніка — чалавека—тварца гэтага багацьця,—абвесьціла „ня—існуючымі" амэрыканская буржуазія.

Як ведама, сучасная прамысловая тэхніка высунула так рэклямаваны цяпер прынцып „навуковай арганізацыі працы". Прынцып гэты мае даць прадукцыі, як кажуць — „максімум машыны і мінімум жывога работніка"; навет самога гэтага работніка, суадказнай дрэсіроўкай — перятварыць у машыну! Прынцып гэты, асабліва шырока тасаваны ў Амэрыцы, даў ёй запраўды-ж нячуваны поступ у павялічэньні выдатнасьці прадукцыі. Але гэты-ж прынцып, тасаваны выключна з пагляду тэхнічна-фінансавага без паразуменьня з інтарэсамі работніцкай клясы, залішне слаба арганізаванай ў краі, каб змусіць лічыцца з сабой, усім цяжарам лёг на амэрыканскі пралетарыят, выкінуўшы вялізарныя масы работнікаў з працы. Такім чынам, аднабокі поступ—побач з „прамысловым росквітам" краю—стварыў вялізарную армію безработных.

Армія безработных дайшла таксама да нячуванай ў Амэрыцы, заўсёды увозіўшай да сябе неабмяжавана работнікаў эмігрантаў з усяго сьвету, — да лічбы звыш 4 мільёнаў...

Амэрыканская статыстыка падае такую „прапорцыю" ўзросту выдатнасьці прадукцыі ў краі з адначасным спадкам учасьця ў прадукцыі работніцкай сілы за апошнія 8 гадоў.

Калі прыняць за 100 агульную вытворчасьць у краю і агульную лічбу занятых у ёй работнікаў у 1923 г.; тады—ў 1919 г. вытворчасьць выразіцца лічбай 84, а лічба работнікаў (працуючых) у краі—108,2; у 1926 г. —вытворчасьць паднялася да 108, тады як лічба працуючых работнікаў упала; ці інакш— за 8 гадоў прадукцыйнасьць краю ўзрасла на 24%, а учасьце ў ёй жывога работніка зьменшылася на 15%!!

Такім чынам „гаспадарчы росквіт краю" ў значнай меры адбыўся коштам работніцкай клясы, якой ён—ня толькі ня даў справядлівай долі ўчасьця ў тым, што створана пераважна яе працоўнай сілай, але да таго яшчэ і значна пакрыўдзішы яе!...

Скуткі такога хібнага „росквіту" коштам жывога работніка сказаліся вельмі хутка: ў цэлым сьцягу галінаў прамысловасьці пачаўся крызіс над-прадукцыі. Ведама, як выхваляў слаўны Форд сваю сыстэму высокіх плату работнікам — з мэтай, каб яны маглі купляць яго аўтамабілі, пашыраючы тым унутраны рынак для яго фабрыкатаў... Але гэтая „аўтамабільная ідылія" канчаецца на нашых вачох: прыйшоў крызіс і ў аўтамабільную прамысловасьць, якая пачала таксама выкідаць работнікаў, тасуючы—дзеля канкурэнцыі—ўсе вастрэй—„навуковую арганізацыю працы", а тым самым усьцяж паглыбляючы крызіс... Раздаваныя работнікам „на раты" аўтамабілі і іншыя рэчы пачалі адбірацца назад праз суды, бо работнікі, выкінутыя з працы, не спаўнялі „ўмовы", якая прадбачыла акуратныя сплаты „ратаў"... Пачалося хваляваньне работніцкіх масаў у краі, шукаючых ратунку ў бядзе...

Амэрыканскі ўрад наагул—„не прызнае" існаваньня безработных, не вядзе ніякай статыстыкі ў гэтай галіне, ня робіць нічога для іх аховы і запамогі...

Амэрыканскае „жыцьцёвае правіла" кажа, што — „кожны павінен сам сабе памагаць"... Такім чынам афіцыяльна і дакладна нічога аб лічбе і лёсе гэтых мільёнаў безработных няведама. Існуе затое — прыватная статыстыка — ня менш точная. Але нагроза расьце ўсьцяж, даводзячы ўсім работнікам відавочна рэальную неабходнасьць стварэньня шырокай клясавай арганізацыі дзеля абароны сваіх правоў і інтарэсаў, а перадусім— падставовага права на жыцьцё і працу!

Узрост гэтай арміі безработных даецца ўжо ў знакі амэрыканскай буржуазіі з усіх бакоў. Ня кажам ужо аб шалёным узросьце праступнасьці ў краі за апошнія гады. Але некалькі мільёнаў спажыўцоў у краі, пазбаўленых здольнасьці набываньня тавараў, гэта-ж — датклівае звужэньне ўнутранага рынку для краёвай прадукцыі, — лішняя прычына прамысловага крызісу ў краі, выклікаеная наагул адсутнасьцяй новых рынкаў для награмаджаных таварных запасаў у краі. Гэты крызіс б'е ўжо ня толькі работнікаў, але і буржуазію.

Такім чынам—у выніку „нячуванага гаспадарчага росквіту"—Амэрыка ідзе да нейкай сацыяльна-гаспадарчай катастрофы, межы якой — цяжка навет прадбачыць. Гэтую катастрофу амэрыканская буржуазія пэўне-ж спрабуе ў суадказны час „папярэдзіць", — тэй ці іншай ваеннай авантурай!

Вось у такіх абставінах ідзе цяпер у Амэрыцы выбарная прэзыдэнцкая кампанія. Такі стан рэчаў дае апазіцыйнай партыі — „дэмакратаў", ня кажучы ўжо аб больш левых, не буржуазных аб'яднаньнях, значныя козыры ў рукі пры агітацыі проці ўрадавай партыі.

Павадыр і кандыдат „дэмакратаў" (сярэдняй і драбнейшай буржуазіі, у тым ліку — хлебаробаў-фэрмераў) і канкурэнт Гувэра — Сміт ёсьць, як ведама, губэрнатарам найвялікшага па значэньню і насяленьню штату і места Нью-Іорка. Галоўная барацьба і мае ісьці паміж гэтымі двума кандыдатамі. У галіне парушанага намі тутака пытаньня, выбарная барацьба гэта мае тое значэньне, што —сама канкуруючая двума сваімі лягерамі— „рэспубліканскім" і „дэмакратычным" буржуазія — раскрывае цяпер шмат тэй праўды аб „гаспадарчым росквіту" краю,—праўды, якую шчыльна хавае супольнымі стараньнямі абедзьвюх партыяў у часы нармальнай працы над „уздымам краю" — шляхам выкіданьня мільёнаў працаўнікоў на вуліцу—без усялякай аховы і апекі!..

Пасьпехі гаспадарчага будаўніцтва ў С.С.Р.Р.

Украінскія буржуазныя і польскія газэты ўвесь час лемантуюць над доляй „прыгнечанага" бальшавікамі ўкраінскага народу, пішуць, што маскоўшчына трактуе Украіну, як калёнію, не клапоціцца аб гаспадарчай і прамысловай разбудове краю.

Але вось факты, якія не можа скрыць буржуазная прэса, гавораць зусім іншае.

Гістарычны шлях „Из Варягов в грэкі" па рацэ Дняпру, дзякуючы нядбальству царскага ўраду, быў амаль зусім няпрыгодны для сучаснага судаходзтва. Гэту шырокую паўнаводную раку перагараджваюць каля вёскі Кічкас, недалёка ад Екацерынаслава, скалістыя парогі. Вада ў гэтым мейсцы гудзіць, пеніцца, як-бы перасьцерагае таго сьмельчака, які-б уздумаў іх пераплыць. І вось, дзякуючы гэтым парогам, ад веку гэты важны водны шлях, які лучыць Кіеў з Чорным, а далей праз Басфор і з Сяродземным морам, быў зачынены.

Але вось у апошнія часы, на гэтыя парогі ўрад зьвярнуў сваю ўвагу. Інжынэры апрацавалі плян будовы аграмаднай заставы на ўсю шырыню ракі, даўжынёй у 700 мэтраў (3/4 вярты) і вышынёй 35 мэтраў. Гэта застава падніме на працягу сотні вёрст увярху ўзровень вады так, што парогі—камені апынуцца глыбока пад вадой і ня будуць перашкаджаць судаходзтву.

Гэта будзе самая большая на ўсім сьвеце застава. Будова яе аблічана на 200 мільёнаў рублёў. Ужо год як каля каліс глухой, маленькай вёскі кіпіць работа. Працуе там 11-ць тысяч работнікаў, для каторых пабудаваны цэлыя работніцкія асады—вёскі.

Карэспандэнт нямецкай газэты „Berliner Tageblat", які нядаўна быў на мейсцы гэтых работ, піша аб іх наступнае:

„Ад часу распачацьця работ у працягу году перавернена ў Днепрастрою 1.280.000 кубічных мэтраў зямлі. На левым беразе ракі пабудуюцца шлюзы, у якіх параходы будуць паднімацца ці спускацца ўніз. Шлюзавая інсталяцыя будзе складацца з трох камор, так, што адначасна могуць быць прапушчаны тры параходы.

На правым берагу будзе знаходзіцца водная электрычная станцыя, парушаная сілай спаду вады з высаты 35 мэтраў. На пачатку мае быць пастаўлены сем турбінаў па 50 тыс. вольт кожная, пасьля праектуюць яшчэ павялічыць на сем такіх-жа турбінаў. Савецкі ўрад спадзяецца, што машыны гэтых разьмераў змогуць збудаваць у сваім краі. Гэта будзе найвялікшая электроўня ў-ва ўсей Эўропе.

Цяпер яшчэ ня ведама (піша карэспандэнт), што будуць рабіць з гэтай аграмаднай сілай электрычнай энэргіі. Савецкі ўрад мае праект будовы вялікіх алюміневых фабрык і розных іншых мэталургічных заводаў.

Савецкая Расея мае незьмераныя магчымасьці і натуральнае багацтва, уласьнікам якіх лічыць сябе Савецкі ўрад.

Думаюць так-жа аб будове прыладаў для вырабу жыдкага паветра, якім маюць шчапаць аграмадныя паклады каменных залежаў. Ужо будуюцца дзьве інсталяцыі для шчапаньня каменьняў, якія пасьля заканчэньня будовы заставы, будуць працаваць далей і вырабляць шчэбень на будову шос.

Будову шасэйных дарог на Украіне урад лічыць за справу ня менш пільную і патрэбную, як электрафікацыя і індустрыялізацыя.

На будову гэтай аграмаднай заставы, якая адбываецца пад кіраўніцтвам найлепшых інжынэраў, паводле самых навачэсных спосабаў і здабыткаў тэхнікі — пойдзе 700 тысяч кубічных мэтраў бэтону. Да канца 1932 году будова мае быць закончана. Заработная плата занятых тут работнікаў выносіць падзёньна—1 руб. 50 кап., але пераважна працуюць на акорд і работнікі выганяюць ад 3 да 4 рублёў у дзень.

Прадукты жыўнасьці купляюць у каапэратывах, якія дастаўляюць усё неабходнае для іх. З гэтых вялізарных праектаў і распачатых работ відаць, што Радавы ўрад дбае аб разбудове ня толькі Маскоўшчыны, але і ўсіх саюзных рэспублік, бо-ж „Днепрастрой“ знаходзіцца на абшары Радавай Украіны.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Да сьвяткаваньня 10-годзьдзя незалежнасьці Польшчы.

Варшаўская прэса інфармуе, што „мерадайныя чыньнікі“ (ўрадавыя—рэд.) пастанавілі, каб сьвята 10-годзьдзя незалежнасьці Польшчы было адсьвяткавана, як урачысьць выключна ўнутранага характару дзяржавы. Згодна з гэтым пастанаўленьнем, паміма папярэдніх намераў, ня будуць высылацца спэцыяльныя запросіны для заграничных дзяржаваў на прыйімо ўчасьця ў гэтых урачыстасьцях.

Прычыны вядомыя...

Польска-француская перагаворы.

15 г. лістапада маюцца распачацца ў Парыжы польска-францускія перагаворы ў справе перагляду польска-францускага гандлёвага дагавору.

Польская прэса інфармуе, што Польшча будзе дамагацца значна большых ад цяперашніх прывілеяў для сваіх тавараў у Францыі.

Ці-ж будзе Францыі „чужая сарачка бліжэй да цела“—ня трудна хіба сказаць.

Перамога сялянскай забастоўкі.

Украінская часапісь „Сель-Роб“ паведамляе аб закончаньні 4-тыднёвай забастоўкі фальварачных і рольных работнікаў у Бадзіцчах. Забастоўка акончылася перамогаю работнікаў.

Яшчэ сялянская забастоўка.

Той-жа нумар „Сель-Робу“ падае, што 20 мін. кастрычніка пачалася забастоўка зямельных работнікаў у вёсках: Ніжняя Башня, Верх. Башня, Моладава і Баравая Гара (ў Любачэўшчыне).

Арыштаваны 2 сябры забастовачнага камітэту.

Забарона „Каапэратыўнага Сьвята“.

Пад такім загалоўкам украінская прэса падае наступны характарыстычны абразок.

„Павятовае Каапэратыўнае Сьвята ў Гарохаве (Валынь) не адбылося.

„Валынскі ваяводзкі ўрад зажадаў ад Камітэту скасаваньня з праграмы Сьвята паходу вуліцамі горада і каапэратыўнае веча пад голым небам. Апрача гэтага, ваяводзкі ўрад зажадаў яшчэ, каб унясьлі пастанову абвясьціць на сьвяточнай Акадэміі, што сёлетняга сьвята ёсьць апошнім і што ў будучыні ўкраінскія каапэратывы павету будуць ладзіць свае сьвята разам з іншымі (буржуазнымі—рэд.) каапэратывамі, у вызначаным на гэта часе“.

Напад на сял.-работніцкага пасла.

Згодна з украінскай сялянска-работніцкай прэсай, („Сель-Роб“ № 72-73) напад на украінскага сял.-работніцкага пасла Хама адбыўся ў наступных варунках:

„21-га м. кастрычніка, у Станіславове, дзе мелася адбыцца веча названага пасла, калі ён вышаў з вагзалу, на яго напала банда азброеных нажамі і каламі злачынцаў. Пасол упаў, пабіты да крыві і страціўшы прытомнасьць, але спраўцы нападу не пераставалі яго біць і штурхаць нагамі. Толькі на крык праходняў зьявілася адсутная на гэты час паліцыя і толькі на выразнае дамаганьне публічнасьці затрымала трох учасьнікаў нападу (з агульнага ліку 15-ці).

„Адначасна мясцовая ўлада забараніла адбыцьцё пасольскага справаздаўчага веча і разагнала сабраных на веча работнікаў, паміма таго, што п. Хам, па атрыманьні лекарскай помачы, хацеў адбыць веча.

„Затрыманых 3 учасьнікаў нападу выпусьцілі на волю.

„Сабраныя намі (прадст. „Сель-Робу“) на наступны дзень інфармацыі і матэрыялы пра напад сьведчаць, якая была крыніца гэтага нападу і хто яго арганізаваў, да асьвятленьня гэтае справы яшчэ вернемся“. Есьць што і нам сказаць...

Дзень ашчаднасьці.

31. X. па ўсім сьвеце лічаць сьвятам ашчаднасьці. У гэты дзень у-ва ўсіх газэтах былі зьмешчаны стацьці, заклікаючыя грамадзянства ашчаджаць грошы і лажыць іх у касы і банкі.

Польскія газэты з гэтае прычыны падаюць статыстыку ўкладаў у Паштовай Касе Ашчаднасьці і зраўніваюць суму з укладамі ў іншых дзяржавах.

Ашчаднасьці на 1. X. выносілі 90 мільёнаў даляраў, што складае толькі 15 прац. даваенных зьберажэньняў, калі ў касах на тэрыторыі сучаснае Польшчы было больш 602 мільён. даляраў. Аўстрыя, якая па ліку насельніцтва ў пяць разоў меншая за Польшчу, мае 140 мільён. дал., паложаных у касы ашчаднасьцяў. Чэхаславакія—(15 міліён. жыхараў) 450 мільён. даляраў, Італія — (38 мільён. жых.) 1 мільярд 100 міліён. дал.

Як бачым, дык польскія грамадзяне зусім нешта мала кладуць у свае касы грошы.

Ці тут людзі ня маюць чаго лажыць, ці мо' ня вераць касам і трымаюць які ёсьць грош у панчохах?—адно з двух.

Загранiцай.

СССР ня будзе плаціць даваенных даўгоў царскага ўраду.

У сувязі з распачынаючыміся працамі міжнароднага камітэту крэдытараў Расеі, — „Известия“ заяўляюць, што праца і ўсе забегі гэтага камітэту—цалком бязмэтныя,—бо радавы ўрад ніколі, у жадным выпадку, ня прызнае і ня будзе плаціць даваенных даўгоў Расеі.

Цікаўная нарада расейскіх манархістаў у Бэрліне.

„А. Т. Е.“ паведамляе, быццам ў гэтых днях у Бэрліне адбылася важная канфэрэнцыя прыехаўшага сюды „цара Кірылы I“ — з мясцовымі павадырамі расейскага манархізму. Кірыла мае намер аб'яднаць усіх манархістаў быццам дзеля „набліжаючайся акцыі“. Асаблівую сэнсацыю выклікала ўчасьце ў нарадах слаўнага „гэтмана Скарападзкага“, які нядаўна афіцыяльна—„прызнаў вярхоўную ўладу цара Кірылы над аўтаномнай Украінай“... Украіна мае ўвайсьці ў склад адбудаванай расейскай дзяржавы, як „Вялікае Княжства Кіеўскае“ — ясна-ж—з гэтманам Скарападзкім на чале. Быццам, на гэтую „ўступку“ нахілілі Скарападзкага нямецкія манархісты, з Гугэнбэргам на чале, якія за ўсялякую цану імкнуцца да адбудовы даваеннай расейскай манархіі. Так даведалася „А. Т. Е.“.

Нямецкі ваенны інструктар у кітайскай арміі.

Як данесла ўжо прэса, новы кітайскі ўрад запрасіў ведамага нямецкага гэнэрала Людэндорфа на становішча арганізатара і галоўнага інспэктара кітайскай арміі. Але, як дадаюць апошнія весткі, нямецкі ўрад ня хоча даць на гэта дазволу гэн. Людэндорфу. Дык замест яго, як пішуць з Лёндану, мае прыехаць у хуткім часе ў Шанхай адзін з бліжэйшых супрацоўнікаў Людэндорфа ў часе вайны, палкоўн. гэнэральн. штабу—Баўэр. Палк. Баўэр будзе ваенным дарадцам кітайскага ўраду і—на чале цэлага штабу нямецкіх ахфіцэраў —мае заняцца рэарганізацыяй кітайскай арміі.

Узнаўленьне радава-нямецкіх перагавораў

З Масквы даносяць, што ў палове лістапада маюць узнавіцца радава-нямецкія перагаворы ў справе перагляду гандлёвага трактату.

Пратэст радавых вучоных.

Латвійскія газэты падаюць весткі з Масквы, што саюз радавых вучоных пастанавіў зьвярнуцца з пратэстам да арганізацыяў вучоных усіх народаў, каб выказаць сваё абурэньне з прычыны варожых адносінаў англійскіх уладаў да радавых вучоных.

Прычынай пратэсту зьяўляецца тое, што англійскія ўлады не даюць радавым вучоным права на ўезд для навуковых досьледаў у землі, якія знаходзяцца пад англійскім панаваньнем: напр. у Індыю, афрыканскія і інш. калёніі.

У адозьве да вучоных усяго сьвету радавая Акадэмія Навук заклікае ўвесь вучоны сьвет пачаць заходы перад англійскім урадам, каб ён даў радавым дасьледчыкам такую самую свабоду, як вучоным другіх дзяржаваў.

праф. Самайловіч едзе ў Амэрыку.

Начальнік радавай ратунковай экспэдыцыі, праф. Самайловіч, які на слаўным крыгаломе „Красіне“ вярнуўся з палярнай падарожжы, у пачатку сьнежня м-ца с. г. выяжджае ў Амэрыку.

За граніцу выяжджаюць таксама памошнік капітана „Красіна“ і некалькі сяброў яго экспэдыцыі, якія прачытаюць у Нямеччыне і ў Чэха-Славакіі сэрыю одчытаў на тэму сваей падарожжы.

Румыны ня ўмеюць кіраваць цягнікамі.

Уначы з 26 на 27 мін. м-ца ў Румыніі здарылася вялікая жалезнадарожная катастрофа. Міжнародны кур'ерскі цягнік „Люкс“ наляцеў на пасажырскі цягнік, у якім ехала шмат вучняў і рабочых. Шэсьць вагонаў ушчэнт разьбітых. У выніку катастрофы забіта 27 асобаў, а 55 моцна пакалечаных, а таксама шмат лягчэй раненых, сярод якіх шмат рабочых і вучняў. Віноўнікам катастрофы, як высьнілася, зьяўляюцца жалезна-дарожныя ўрадоўцы, якія пасьпелі ўцячы.

Мусоліні пацяшаецца.

У нядзелю 28-га мін. м-ца ў Рыме адбылося урачыстае сьвяткаваньне шостых угодкаў „маршу фашыстаў на Рым“. У часе ўрачыстасьці, фашыстаўскі дыктатар Мусоліні сказаў вялікую прамову, у якой выхваляў свае ўласныя заслугі, а таксама ўсе тыя „дабрадзействы“, якія, дзякуючы яму, сплылі на ўвесь італьянскі народ. Мусоліні пахваляўся, што ўлада яго ёсьць наймацнейшая і павінна ў хуткім часе трасьці ўсім сьветам... Эх, рана птушачка запяяла!..

Гандлёвы дагавор паміж Літвой і Нямеччынай падпісаны.

30. X. у Бэрліне падпісаны гандлёвы дагавор паміж Нямеччынай і Літвой. Дагавор гэты, апрача эканамічнай, мае яшчэ вялікую палітычную вартасьць. Падпісалі яго праз некалькі дзён пасьля разрыву нямецка-

З Сойму.

У сераду 31 кастрычніка, згодна з канстытуцыяй, адбылася першае паседжаньне Сойму ў восеньняй сэсіі, якое трывала дзьве гадзіны.

У пачатку паседжаньня марш. Дашынскі прачытаў дэкрэт Прэзыдэнта Рэспублікі і паведаміў аб зьмене Ураду, адбытай улетку. Далей маршалак паведаміў аб трэбаваньні з боку Суда выдачы некалькіх паслоў: двох „Вызваленьня“, па аднаму — з Сялянскай Партыі (Stronnictwo Chłopskie), і нац. работніцкай партыі, трох камуністаў — Ворскага, Бітнэра і Росяка, з „Сельробу-Лявіцы“—Вальніцкага і з Беларускага Сялянска-Работніцкага Клюбу — Ф. Валынца і І. Дварчаніна. Усіх памянёных трэбуюць выдачы за маніфэстацыі ў часе працэсу Грамады. Зараўднай сэнсацыяй зьявілася трэбаваньне аб выдачы п. Дзедушыцкага, сябры „адзінкі“.

Пасьля гэтага выступіў мін. скарбу Чэховіч для прадстаўленьня справы бюджэту. Са слоў яго вынікае, што даход прадбачыцца ў суме 2.809 міл., выдаткі—2.802 міл., у прыраўнаньні да папярэдняга году зьвялічаны на 5 працэнтаў.

Пераходзячы да налогаў, міністар паказаў на неабходнасьць „рэформы“, а іменна— будзе зьвялічаны пазямельны налог, а зьменшаны падаходны, ад абароту (прамыслоўцаў і купцоў).

У канцы прамовы Чэховіч, баронячыся ад нападу галоўна эндэцкай прэсы за этатызм, заявіў—„будучыня Польшчы (пэўна-ж такое, як думае міністар) зьвязана з разьвіцьцём прыватнай ініцыятывы“.

Пасьля прамовы міністра маршалак Сойму сказаў, што наступнае паседжаньне адбудзецца 6 лістапада ў 3 гадз. дня.

Зьвялічэньне Клюбу „Сель-Роб — Лявіца“.

Як даведваемся, Украінскі Сойм. Клюб Сель-Роб—Лявіца зьвялічыўся пераходам у гэты Клюб пасла Сэнюка, які быў дагэтага ў Сель-Робе—Правіцы.

Уладзімір Астроўскі.

Байка.

Дзесьці, каля ракі Дзьвіны, дзе жывуць паны, жыў сабе бедны селянін-земляроб.

Жыў, цяжка працаваў, усе сілы на працу пакладаў, потам сваю ніўку паліваў,— а бедаваў, бедаваў і бедаваў...

Злыдні, як тыя мышы, у-ва ўсе шчэлкі яго старэнькай халупы залязалі. На саломе спаў. Старым кажушком накрываўся, пад галаву на-нач сумныя думкі падкладаў,—думкі пра заўтрашні горкі дзень, пра сыноў, для якіх зямлі не хапае ды якія выйдуць з хаты ў сьвет на голад і паняверку.

Што будуць яны ў сьвеце рабіць? Дзе знойдуць сабе скарынку штодзеннага хлеба? Можа стануць гаротнымі папіхачамі ў чужынцаў. Можа зьгінуць з голаду пад чужым парканам? Можа выедуць за далёкае мора, каб там стаць белымі нявольнікамі, якімі калісьці былі іх дзяды на Бацькаўшчыне? А можа ў цёмную матку-ночку з голаду возьмуць дубіну ды гайда на шырокую дарогу, а потым згніюць у вастрогах?

Трудна бацьку так варажыць пра сваіх сыноў.

Але-ж мусяць яны кудысьці пайсьці, бо зямлі як няма, так і няма; зямля ня чума, яе не „разьвядзеш“.

Каб ім даць грошы, эт так „на шчасьце“, можа з грашымі і знашлі-б сабе шматок хлеба!

— Грошай даць? Ха-ха-ха! — горка засьмяяўся, аж сьцены здрыгнуліся.

Палючы, страшны сьмех бедняка-беларуса.

Грошай? А скуль?

Калі розныя павукі перагрызьлі яго кішэні. Ледзь запрацуеш дзе-што, пакладзеш да кішэні, як яны цераз дзюркі і выцеклі. Ізноў запрацуеш, ды ізноў выцякаюць. Так проста ў ляпу вось гэтых павукоў, п'явак ды розных галаваськаў. А якія тоўсьценькія ды гладзенькія яны! Якія камянічкі яны маюць! Сколькі нашых грошай у іх!

Цяжка задумаўся небарака-земляроб.

І чуе:

Нешта шэпча яму родная ральля: „Гною дай, а я стану радзіць залатое жытца ды пшанічку на піражкі, ды такія пухлявыя, ружовыя ды белыя, як тварык беларускай дзяўчыны“!

Шэпча яму занядбаны садок: „Даглядзі мяне, а я прагадую цябе і дзетак тваіх“!

Мычыць жалабна кароўка са ўпалымі бакамі: „Пашы, сытнай пашы дай! А я дам табе шмат-шмат малака, а такога густога, як сьмятана“!

Гудзяць над яго вухам пчолы: „Даглядзі нас, вуліка нам новага дай, а мы табе так засалодзім жыцьцё, як толькі можа засаладзіць яго маладая пешчатлівая кабетка, твая Альжбетка“.

Усе просяць: „Дай, дай“!

Так зараз гэтыя грошы і возьмеш, калі лезуць яны вун цераз дзіравыя кішэні ў ляпу тых павукоў ды п'явак?!

— Хі-хі! — піскнуў дзесьці павук, — я дам табе грошай, толькі ты дазволь высасаць з цябе вось так працэнтаў са сто ў год!

Схапіўся наш небарака змучанымі рукамі за галаву. Зьвесіў яе, як зьвешвае галінкі плакучая бяроза. А з вачэй яго цураць кроплі за кроплямі і гарачынёй сваей аж зямлю перапальваюць.

— Хто, хто паможа мне? Хто ратуе ад гэтых павукоў ды п'явак? Хто абароніць мяне ад голаду, нявольніцтва, ды страшнай спакусы?

. . . .

Раптам чуе нямы голас:

— Я!

Падняў вочы. Хіснуўся назад. Яскравы бліск асьляпіў яго.

Перад ім — сонечная Байка. Вочы — як зоркі на небе. Тварык — як краска лясная. Вусны так чысты і сьвяты, што хоць маліся ім. Грудзі дыхаюць сонечнай цяплынёй, любоўю і спачуцьцём.

— Я памагу табе! — шэпчуць яе вусны шопатам нашых вясновых узгоркаў,—я ўсё зраблю для цябе, толькі павер мне, толькі ўпусьці мяне ў сваю хату, толькі слухайся мяне! Не абяцанкі-цацанкі сулю табе, не баламуціць цябе зьбіраюся, а памагчы ў тваей нядолі і горы!

Шэпча байка далей свае салодкія, чароўныя словы:

— Я пражану ўсіх тых павукоў ды п'явак. Я зачарую тваю кішэню і ня адзін грош ня выцячэ праз дзюркі твайго кішаня. Я збудую табе новую хату і ў ёй ствару зямны рай: прынясу часопісаў, кніжак, музычных струмэнтаў, радыё. Я дам табе карысную пазычку на гаспадарку. Я дам табе штучныя ўгнаеньні, машыны, прылады. Я прадам выгадна твой хлеб і ўсе твае гаспадарскія прадукты. Я закладу для цябе ўласныя крамкі, фабрыкі, дзе ты сам будзеш купляць, прадаваць і перарабляць прадукты твайго мазаля. Я пабудую для тваіх дзетак родныя школы, народныя дамы, бібліятэкі, спартовыя салі, тэатры і шпіталі. Я выбрукую твае балотныя вуліцы. Я дам тваім беззямельным і малазямельным сынам добра аплачаную работу ў тваіх уласных родных прадпрыемствах. А калі табе прыемна будзе езьдзіць, дам табе веласіпэды, аўтамабільчыкі...

Байка ўкленчыла перад бедным беларускім земляробам і, абыймаючы яго калені, благаючы шаптала:

Я ўсё, усё зраблю для цябе. Для сябе-ж я нічога не жадаю. Аднаго толькі вымагаю:— пакахай мяне, ідзі хутчэй за мной. Я дам табе шчасьце, якое ніколі ня сьнілася ні тваім бацькам, ні табе беднаму.

Задумаўся земляроб. Прывык да баламутных абяцанак, а тут—няўжо шчырасьць?

— Перастань быць упартым, — маліла байка,—павер мне—і станецца дзіва. Я вызвалю цябе з нявольніцтва.

— Веру,—нарэшце сказаў земляроб, — веру, бо мушу верыць, што ня можа так вечна быць, што „засьвеціць сонца і ў нашае ваконца“. Але скажы мне, мая добрая байка, як імя тваё, каб я ведаў, да каго зьвяртацца мне?

Нябескі ўсьмешак пакрыў вусны байкі і, падаючы сваю цудадзейную руку, сказала:

— Маё імя — Каапэрацыя.

Вольны перакл. з украінскага П.

Спадар гілюе.

(Заходня-беларускі расказ. Паўпроцанту фантазіі).

Кандыдат у прафэсары сталічнага ўнівэрсытэту, Янка Спадар рабіў рэпэтыцыю.

Бубніў лекцыю ў Беларускай Гімназіі ў Вільні.

Як толькі пачаў Спадар зьвязіць пра сваяцтва славянскіх моваў, дык з густа заселеных лавак гімназістых пачуўся шык... гік... кацячы канцэрт.

Большасьць слухачоў шуганула ў дзьверы, пакідаючы салю.

Стройны хор вучняў дружна запяяў: „Ад веку мы спалі“...

Лекцыя сарвалася. Цэлую ноч канфэраваў зьвяз „Трох Братоў“, — арганізацыя бяз адрэсу, бяз дзённага сьвятла, без заўсёднага, гэтак кажучы, начулішча.

Назаўтра Спадар прыйшоў добра аглядзець месца свае няўдачы, каб лепш падрыхтавацца да чароднага свайго выступленьня. У руках ён ужо меў здаравенную сукастую палку з роднага дуба.

Пры зьяўленьні Спадара ў рэкрэацыйнай салі пачуўся гэткі магутны, дружны кашаль вучняў, што навет і зусім нармальны чалавек мог-бы крыху страціць сваю раўнавагу. А Спадара дык гэта зусім разьюшыла. Яго шырачэнны рот разьзявіўся, як толькі мог і на ўсю сваю сілу зароў:

— Бандыты!

А ў адказ яму паляцела:

польскіх гандлёвых перагавораў, а таксама напапярэдадні польска-літоўскай канфэрэнцыі ў Кэнігсбэргу. Гэта, як пішуць газэты, „нясмачная дэманстрацыя“ ў бок Польшчы.

Забастоўка партовых работнікаў у Аўстраліі прадаўжаецца.

Выбухшая некалькі тыдняў таму назад забастоўка партовых работнікаў у Аўстраліі прадаўжаецца. Прадстаўнікі вялікіх карабельных прадпрыемстваў нанялі на месца забаставаўшых работнікаў італьянцаў і грэкаў, але бастуючыя работнікі абкідалі іх бомбамі. Паліцыя вядзе „энэргічнае сьледзтва“ і наводзіць свае „парадкі“.

Вэнгэрскія студэнты пабілі свайго рэктара.

Як вядома, нядаўна вэнгерскія студэнты, належачыя да розных нацыяналістычна-фашыстаўскіх арганізацыяў, устроілі антыжыдоўскія дэманстрацыі, праклямуючы пагром жыдоў.

Калі рэктар унівэрсытэту, убачыўшы, што на сьценах унівэрсытэту наклеены антыжыдоўскія адозвы, пачаў іх зьдзіраць, баеўка фашыстаў-студэнтаў за гэта яго моцна пабіла. Вось табе і „высокая заходняя культура“!

Клопат з безработнымі ў Англіі.

Лік безработных у Англіі з кожным днём значна павялічваецца. Згодна ўрадавых статыстычных даных на 1-га кастрычніка с. г., у Англіі было безработных 1.336.400 чалав. гэта зн. на 260.000 больш, як было у тую самую пару ў мінулым годзе.

Калі ўзяць пад увагу, што гэтыя даныя ўрадавыя, дык фактычны лік безработных можна было-б лічыць удвая больш.

Вось-жа ангельскі ўрад мае вялізны клопат з сваімі безработнымі, бо баіцца іх, як агня, асабліва пасьля таго, як безработныя ўстроілі першую ў гісторыі ангельскага народу дэманстрацыю проціў каралеўскай пары, якая варочалася з падарожжы ў Лёндан. Шмат „працы“ палажыла паліцыя, пакуль удалося ёй разагнаць безработных дэманстрантаў.

Англійскія капіталістыя паразумеліся з канадыйскім урадам, які дазволіў на ўезд у Канаду для двох мільёнаў безработных з Англіі.

Дагэтуль яшчэ ніхто ня чуў пра так вялізную аднаразовую эміграцыю.

Толькі невядома, ці гэта мерка ўратуе Англію ад таго цяжкага эканамічнага і палітычнага становішча, якое з кожным разам становіцца там яшчэ цяжэйшым.

Ізноў скандал з скрадзенымі дакумэнтамі

Паміж „прыяцелямі“ — вялікімі дзяржавамі ня спыняюцца „дробныя выпадкі“ ўзаемнага шпіёнства дый падступнага... абкраданьня. Крадуць рэчы, найбольш каштоўныя для ўласьніка, дый пажаданыя таксама для зладзея—прыяцеля... Толькі што адгучэла скандальная афэра з тэкстам „англа-француската марскога кампрамісу“, як разразіўся новы скандал. Новае скандальнае зладзейства адбылося на груньце „прыязных стасункаў“ паміж Францыяй і Італіяй. Нейкі спрытны ўрадовец італьянскага консульства ў Ліоне (на поўдні Францыі) „здабыў“ сьцяг сэкрэтных дакумэнтаў, якія датычаць мераў, якія францускі генаральны штаб прыняў — каб забясьпечыць бясьпечнасьць на француска-італьянскай граніцы, а таксама — Сярод-земным моры — з боку Італіі.

Вялізарная працi-польская дэманстрацыя у Бэрліне.

„П.А.Т.“ даносіць аб вялізарнай дэманстрацыі школьнай моладзі Бэрліна, распачаўшай „тыдзень падтрыманьня нямецкай справы заграніцай“.

У дэманстрацыі прынялі ўчасьце вучні ўсіх школаў у Бэрліне — з сьцягамі лятарнамі і паходнямі. Прамовы арганізатараў і павадыроў дэманстрацыі дыхалі ненавісьцяй да Польшчы і вострымі выступленьнямі проці быццам панующага ў Польшчы і ў італьянскім тыролі прасьледаваньня нямецкага школьніцтва. Усе аратары заклікалі слухачоў да зьбіраньня фонду і да закладзінаў арганізацыі, якія дадуць магчымасьць падтрымліваць тайныя, „падарожныя“ нямецкія школы ў Польшчы.

Наша хроніка.

Канфіскаты. Па загаду Гарадзкога Старасты на м. Вільню канфіскаваны № 7 газ. „Слова Працы“ за: 1) перадавіцу **„Полярызацыя сілаў“**, у якой на факце расколу ў ППС падводзіўся біляно паступовага нарастаньня грамадзкіх сілаў на двох полюсах— буржуазным і сялянска-работніцкім пры аднадачасным упадку сярэдзіны; 2) артыкул — **„Пад клясавым штандарам“**, у якім падавалася кароткая гісторыя беларускага адраджэнскага руху пад кутом гледжаньня работніцка-сялянскай ідэалёгіі; 3) артыкул—**„Дзесяць гадоў“**, у якім падбіваўся вынік дзесяці гадоў існаваньня Польшчы ў адносінах да працоўных масаў; 4) заметку ў палітычнай хроніцы: **„З сялянскай забастоўкі ў Грэчэнэ“**.

№ 8 газ. „Слова Працы“ канфіскаваны за: 1) перадавіцу **„Да апошніх падзеяў у Віленскай Беларускай Гімназіі“**, у якой тлумачыліся факты тэрору над вучнямі з боку некаторых сяброў Пэдагогічнай Рады Гімназіі за захаваньне іх на лекцыях Я. Станкевіча і па яго ўказцы; 2) Фэльетон—**„Маленькія, але разумныя“**, у якім перадавалася ў форме казкі аб працы пчол і 3) карэспандэнцыю — **„З Т-ва Бел. Школы“**, якая перадавала парадак сходу Акружное Управы ў Горадні, трэба сказаць, з значнымі перапробкамі з увагі на цэнзуру. Вельмі цікава, што ў папярэднім № 7 гэтая карэспандэнцыя таксама была, але ў паведамленьні аб канфіскацэ аб ёй не ўпаміналася.

№ 9 газ. „Слова Працы“ канфіскаваны за: 1) перадавіцу **„Хто вінаваты“**, у якім разьбіралася прычына ліквідацыі забастоўкі ў Лодзі; 2) верш М. Васілька — **„За родную школу“**, 3) артыкул—**„Эўропа гуляе ў „разбраеньне“, а Кітай узмацняецца“** і заметку ў **„Нашай Хроніцы“** пад загалоўкам **„Вынікі неадбытага Зьезду“**, у якім паведамлялася аб вобысках у сяброў Т-ва Бел. Шк., выбраных дэлегатамі на агульны Зьезд.

Грамада—здабычай Варшаўскага бруку! Бруковы „Kurjer Czerwony“ з 27 кастрычніка 1928 г. у заметцы: „Białorusini na drogah lojalności państwowej“ падае: „У апошнія часы ў беларускіх арганізацыях, зьвязаных з даўняй Грамадай, выступаюць тэндэнцыі да лёяльнай працы на груньце польскай дзяржаўнасьці.

Сягоньня прыяжджае да Варшавы віленскі ваявода п. Рачкевіч, які прадставіць Ураду ўвёсак аб злагоджаньні лёсу асуджаных віленскім судом павадыроў Грамады“. Значыць—былі праўдзівыя чуткі аб цалаваньні новымі санатарамі панскіх ботаў. Але дарэмныя турботы. Паўна-ж і ня сьняць іх, што іх хочуць „апчасьлівіць“, а тым часам выстаўляюць, як прадмет сэнсацыі варшаўскага друку. Цікава, што паважнейшыя газэты нейк аб гэтым маўчаць.

Новая судовая справа. Як інфармуюць, проці былога пасла Рак-Міхайлоўскага ўзьнікла новая судовая справа, у якой навет закончана сьледзтва і ўсе матар'ялы адасланы віленскай пракуратуры. Абвінавачваюць Сымона Рак-Міхайлоўскага з арт. 129, ч. III К. К. за ўпраўлены мітынг адбыты ў м. Доску у 1924 г. аб працы Беларускага Пасольскага Клюбу.

Дабрадзейства амністыі датклуліся і засуджанага на 12 гадоў былога пасла Рак-Міхайлоўскага, але яму даравалі 3 месяцы кары, на якую ён быў засуджаны судзьдзёю пакою, за нібы надрукаваньне нейкіх адозваў. Ёсьць чаго радавацца і дзякаваць.

Цікавы выпадак з былым паслом Валошыным. Як так даўно адміністрацыя турмы у Равічах, дзе знаходзіцца былы пасол Валошын, абвесьціла яму, што ён звольнены з турмы. Калі зьдзіўлены Валошын запытаўся: „на якой падставе“. Дык яму адказалі: „не разважаць і хутчэй апранацца“.

У канцэлярыі турмы яму перадалі дакуманты аб звальненьні. Лічучы тое, што рабілася, за непаразуменьне, Валошын яшчэ запытаўся: „А як-жа з маімі сябрамі, ці яны таксама будуць звольнены“? Яму таксама і тут адказалі: „не разважаць“. Не разумеючы да канца, у чым справа і не жадаючы папасьці ў нейкую пастку, Валошын заявіў, што ён без сваіх сяброў з турмы ня выйдзе. Адміністрацыя мусіла званіць у Вільню і даведацца, у чым справа. Пасьля высьвятленьняў Валошын астаўся ў турме. Як перадаюць, высьвятлілася, што за паслом Валошыным, апрача агульнае справы, лічыцца шмат і драбнейшых спраў. Як відна, за адну з гэтых спраў Валошын адбыў кару і суд, відаць, забыўшыся, што справа ідзе аб пасьле Валошыне, чуць ня звольніў яго.

Адным словам чуць ня сталася сэнсацыя.

Трэбаваньне выдачы паслоў доктара І. Дварчаніна і Ф. Валынца. Перад адчыненьнем гэтае сэсіі Сойму марш. Дашынскі паведаміў, што пракуратура, між іншымі, патрэбавала выдачы ад Сойму паслоў Беларускага Сялянска-Работніцкага Клюбу д-ра І. Дварчаніна і Ф. Валынца. Прычынай нібы была маніфэстацыя гэтых паслоў у часе прысуду над Грамадой з кіданьнем імі красак. Аднак, па Вільні проста ўпорліва ходзяць чуткі, што тут справа не абыйшлася бяз новае беларускае здрады, якой гэтыя паслы былі галоўнай плямай на воку. Дапраўды — дачаго мы дажыліся?! Няўжо-ж гэта праводзяцца ў жыцьцё крылатыя словы аднае „madam“, што цаной загубленьня цяперашніх паслоў, трэба звольніць папярэдніх? Прыпомнім цьверджаньні Янкаўскага „Народу“ аб тым, што „Грамада“ была нацыянальнаю партыяй (і нібы Янка з сваімі заплечнікамі такім і астаўся), а што „дварчанінаўцы“ — гэта „інтэрнацыянальныя жулікі“. Але дзе-ж тады лёгіка?! „Гэтых“ пасадзіць толькі за тое, што яны кідалі краскі „тым“, якіх цяпер дзе—хто думае „ашчасьлівіць“!? Думаем, што ў вачох беларускіх працоўных гушчаў гэтая гульня „ў лепшых і горшых“ ня так цікава, як некаторым „madam“, але і цяперашнія паслы таксама для іх вельмі дарагія.

Угода і здрада. У апошні час угодніцкія газэты „Сялянская Ніва“ і „Biel. Krynica“ амаль што цэлыя старонкі ўдзяляюць Янку Станкевічу і тым дзеячом, каторыя раней былі ў сялянска-работніцкім кірунку, цяпер-жа, захаваўшыся за плячыма яго (і Каўша) вядуць ужо ня згодніцкую лінію, а проста здрадніцкую. Дзеля таго, што гэтыя дзеячы раней ацэньвалі работу сельсаюзьнікаў і хадэкаў, як работу ўгодніцкую, якою яна была і ёсьць, а сябе выстаўлялі, ясна-ж, прыхільнікамі сялян і работнікаў, — дык успомненыя ўгодніцкія газэты становяцца ў позу Дон-Кіхотаў і кажуць, што ў іх была і ёсьць праўда.

Мы проста ня хочам яшчэ пісаць іменьняў гэтых людзей, ведаем, што яны самі вылезуць на паверхню з сваёй безаглядднасьцю і гульнёю „ва-банк“, дык няхай самі, як малыя дзеці, нясуць і кару перад працоўнымі гушчамі за сваю здраду, чым вытрасаць іх, як сьмяцьцё з кошыка.

Але мусім сказаць і ўгоднікам, што факт здрады некалькіх асоб ня дасьць козыру і ў вашай гульні ў баламучаньне масаў. Гэтым вы сялянска-работніцкай справе не пашкодзіце ні на грош, бо яна дзержыцца не на якіх небудзь асобах, а на той праўдзе, якая зьмяшчаецца ў цэлай сялянска-работніцкай думцы, а гэтую праўду змушаюць выяўляць такой, якою яна ёсьць, тыя абставіны, у якіх знаходзіцца беларускі селянін і работнік. Пакуль гэтыя абставіны ня зьменены, будзе жыць і сялянска-работніцкая праўда.

Прыпомнім, што ў часе выбараў вы пісалі, што „з грамадоўцаў асталіся толькі Пекачы і Мэнкі, а з вамі нібы пашла большасьць б. Грамады, але час паказаў поўную няпраўду вашых тагочасных слоў. Ясна, што вы ўсе — і цэленькія і чысьценькія, а сялянска-работніцкая думка праходзіць цярністымі шляхамі, аднак, яна была і ёсьць моцнаю і ў насьлядоўнікі яе ў ваш бок ніколі ня пойдуць, бо вы — па праўдзе кажучы — выяўляеце думку кулацтва.

Што-ж тычыцца здраднікаў, дык яны на цэлую сялянска-работніцкую масу абсалютна нічога ня значаць і як не папсуюць сялянска-работніцкае справы, гэтак не паправяць і вашай. Яны толькі пойдуць да паноў лёкаямі і аб іх усяго ўспамін і астанецца, што калісь выпадкова былі ў работніцка-сялянскай сям'і. Бяз іх ужо колькі часу ідзе справа і нічуць ня зьменшылася. Няхай ідуць — жоўтым пясочкам дарожка! А ваша праўда, як была, так і ёсьць—лыкам сланая. Ніхто вам не паверыць у вашую „праўду“.

Падрабнейшае апісаньне фактаў у гімназіяльным жыцьці падамо, па магчымасьці, у наступных нумарох.

Камуністычны (?) тэрор (!) проці „Strzelca“ (?!). У пачатку мінулага кастрычніка польскімі ўладамі арыштаваны сэкрэтар Т-ва Белар. Школы ў Вялейцы грам. Усьціновіч. Для беларускага грамадзянства, ведаўшага Усьціновіча, гэты арышт быў вельмі вялікай і дзіўнай „неспадзянкай“, бо-ж грам. Усьціновіч, апрача працы на ральлі ды ў Таварыстве Белар. Школы, ніякай палітыкай не займаўся, а тым больш быў далёкі ад крымінальнага праступства. Аднак, прычыну арышту дзяржалі ў „глыбокай таямніцы“, што яшчэ больш зьдзівіла і зацікавіла ўсё грамадзянства, чуўшае аб гэтым вусна, або з газэты. Але-ж не дарма кажа пагаворка, што: „не бяз добрых душ на сьвеце“ — і „добрай душой“ на гэты раз зьявіўся „дэмакратычны“ „Кур. Віл.“, які „пастараўся“ раскрыць шырокай публіцы гэтую таямніцу.

У № 247 „Kur. Wil.“ піша, што: „Апошнім часам, згодна з распараджэньнямі з Менску, камуністычныя агенты, працуючыя на абшарах паўночна-ўсходніх земляў, праявілі інтэнсыўную акцыю ў кірунку ўнемажлівеньня працы арганізацыяў „Wychowania Fizycznegz“ (Strzelca—Рэд.), абмысьлянай падрабязна агітацыяй і тэрорам проці кіраўнікоў гэтай арганізацыі. Адным з правадыроў гэтай работы быў сэкрэтар Т-ва Белар. Школы ў Вялейцы Усьціновіч, які ў свой часе і быў арыштаваны. У часе сьледзтва аказалася, што Усьціновіч з яшчэ 2 сябрамі плянаваў (?!) замах на каманданта „Strzelca“ ў Вялейцы, пар. Джэвецкага.

„У часе рэвізіі ў іх знойдзена зброя і дакумэнты „stwierdzające“, што ў Усьціновіча ёсьць у СССР брат — бальшавіцкі камісар. Па засаджэньні Усьціновіча ў турму, здавалася, што ўся „акцыя“ заціхла. Аднак-жа, надовячы праходзячага вуліцаю сябру тамашняга „Strzelca“ зачапіла некалькі чалавек, хочучых пэўна справакаваць „zajście“. Зачэплены паклікаў паліцыянта, перад прыбыцьцем якога авантурнікі ўцяклі“.

„Аднак, вечарам на таго „стшэльца“ напалі тыя-ж самыя авантурнікі і так „дакліва“ пабілі, што яго мусілі памясьціць у шпіталь. Сьледзтва выявіла віноўнікаў нападу, якіх у ліку 7 чалавек пасадзілі ў турму“.

Вось-жа тут і разьбярыся!

Асаблівая апека. На днях адбылася нарада Рады Міністраў з учасьцем ваяводы Рачкевіча, на якой абгаварвалі справы Віленшчыны. Адначасна газэты падалі вестку, што міністар Складкоўскі ў гэтых днях рабіў інспэкцыю ў Віленскім ваяводзтве і нібы запрапанаваў насяленьню Віленшчыны... зьмяніць спосаб землякарыстаньня — заместа жыта, сеяць лён. Вячэрнія варшаўскія газэты не бяз гумару тытулуюць — „сей лён, а жыта табе само прыедзе“!

Усё-ж у зьвязку з папярэдняй ухвалай віленскага кола „адзінкі“ і зьмешчанай ведамасьці аб Грамадзе — нашай Віленшчынай „заапекаваліся“, відаць, не на жарты!

Прыгавор над студэнткамі. Надовячы закончыўся ў Акружным Судзе ў Вільні працэс студэнтак Альшавічанкі, Львавянкі, і іншых, якім закідвалася „прыналежнасьць да сьпіску, маючага на мэце пераварот у існуючым дзяржаўным ладзе і ўвядзеньне дыктатуры Радаў (Советаў)“.

Суд прыгаварыў: Канстанчыка на 12 гадоў цяжкага вастрогу, Альшавічанку, Львавянку, Погоду і Цукермана на 8 гадоў цяжкага вастрогу і Плоткіна на 6 гадоў цяжкага вастрогу.

Адным словам, казённага хлеба не шкадуюць!...

Цікавае „шчасьцьце“. Згодна з віленскай прэсай, з адным паліцыянтам, поўнячым службу на віленскім вагзале, здарыўся наступны досыць цікавы выпадак:

Заўважыўшы пакінуты бяз ніякага дагляду пакуначны кошык, ён забірае яго, думаючы, што ён пакінуты памылкова. Па зрэвідаваньню аказалася, што там было аж 12 кіляграмаў камуністычнай літэратуры!...

Напад у Дзісьненшчыне. Надовяшняй ноччу на дом жыхара засьценку Канторы, Шаркаўскай воласьці Алеся Катыржа, напалі 4 азброеныя бандыты якія забралі 1000 злотых, 150 даляраў і 100 руб.

Мэтамарфоза К. Крука. Па Вільні ходзяць зусім праўдападобныя чуткі, што К. Крук, прадстаўнік работніцкае лявіцы ў мейскай Радзе м. Вільні, заместа таго, каб ісьці па шляху работнікаў і сялян, як іх выбарны, зьбіраецца, па загаду нашых „сланеў“, перабраць ад Т. Вярнікоўскага знамянітую „круцёлку“, ці „шулерню“, г. ё. ігорны прытон, дзе абіраюць лёгкаверную публіку гульнёй ў лёто і, здаецца, іншыя гульні. Гэты ягомасьць ходзіць паміж грамадзянствам і спакушае, каго ўдасца, вялікімі барышамі ад круцёлкі, але, здаецца, марна.

Вельмі цікава для К. Крука, што ён рашыўся на такі раптоўны зварот у сваёй лініі паступаваньня, калі раней любіў быць „усім добрым“. Але пачатак зроблены ўжо подпісам аб адкладзе зьезду без паразуменьня з беларускім грамадзянствам.

Спадзяёмся, што работніцкія беларускія масы м. Вільні ацэняць, як належыць, падобныя паступкі раднага К. Крука, але мы мусім тут зьвярнуць увагу на „закуліcы“. Наша беларуская сканычаная „санацыя“, пацярпеўшы ўсюды паражкі, шукае „спосабаў жыцьця“ і надбала на „шулэрню“, каб зрабіць яе крыніцай сваіх „культурніцкіх“ імкненьняў і выставіла „ўдалога“ К. К. на

— Фашысты!.. Дзікун!..

Спадар схапіў за чуб аднаго гімназістага і піхнуў яго на сьцяну.

— Хлопцы! Вязаць яго... Шалее!

І тут добры дзесятак вучняў пачаў увіхацца каля Спадара.

Зьвязалі яму рукі нейкім круцялём, выперлі на падворак, пасьля на вуліцу, клікнулі дрынду і патарабанілі ў шпіталь, проста ў „Жоўты Дом“.

— Маеце,—сказалі там, — новага пацыента: прафэсар, нятыкальны, а гэтак тыча, каго папала, што й веры не дасьцё... Гілюе дый годзі.

— Што з мяне вар'ята рабіць! — зароў на ўсе лёгкія Спадар.—Ня дамся!..

Зьявіўся доктар, і два здаравяцкія хлапцы з шпітальных слугаў пачалі насоўваць на Спадара спэцыяльную сарочку.

Адзін дзень і адну ноч ціхенька прасядзеў у шпіталі Спадар.

Пасьля з яго зьнялі спэцыяльную сарочку і пачалі „бадаць“ дактары.

Задумаліся: вар'ят ні вар'ят, а нешта вельмі да яго падобнае.

Адзін доктар кажа:

— Ахвяра біблейскага грэху!

Другі кажа:

— Маніяк!

Трэці:

— Э, ды тут усё, здаецца, разам сплялося!

Аднак, рашылі выпусьціць на волю Спадара.

Выйшаў ён, небарака, з „Жоўтага Дому“ і пяруном пасмаліў у свой „Гаспадарчы Зьвяз“.

Як на бяду там быў у гэты час адзін нямілы Спадару студэнт-беларус.

— Вы што гэта? — зьвярнуўся Спадар да зьдзіўленага студэнта,—солідарызуецеся, значыцца...

— Што?.. З кім солідарызуюся?—пытаўся зусім аслупеўшы студэнт.

— Як то што?!. А з тымі згаджаецеся, што мяне ўчора аж вун куды зацягнулі! Вар'ятам мяне зрабіць хацелі!

— Выбачайце,—адказаў студэнт,—вар'ятам можна зрабіць таго, хто яшчэ хоць крыху нармальны... А вы...

— Што вам я?!. Памятайце, што я нятыкальны!—закрычаў Спадар на студэнта.

— Для паліцыі, дык мо' вы і нятыкальны, а так, дык не, бо да вас-жа, самі кажаце, учора даткнуліся, — спакойна адказаў студэнт.

— Ах, ты жу...—зароў ад злосьці Спадар і замахнуўся на студэнта.

Студэнт засланіўся тэкаю, а ў адказ гэтак мазануў па Спадаровым аблічччы, што ледзь бліна з яго не зрабіў.

Мала гэтага.

Назаўтра да Спадара прыйшлі два сэкунданты ад студэнта, каб гэта сатысфакцыі патрэбаваць, значыцца.

Спадар накінуўся і на сэкундантаў:

— Чаго вам тут? Ратунку няма!.. Ня дам разваліць **Зьвязу**!

— Ды мы не да Зьвязу вашага, а проста да вас... Вы ўчора зьняважылі нашага калегу,—адказвалі студэнты.

Пачуўшы гэта, Спадар выскачыў за дзьверы, на якіх напісана было **„Начулішча“**, і замкнуўся там.

Але назаўтра паслаў аднаго з сваіх спадаронкаў на мір да свайго праціўніка. Той патрэбаваў фармальных сэкундантаў, адмаўляючыся ад усякіх перагавораў з Спадаром.

Бедныя сэкунданты: сустрэўшыся, каб разабраць гэткі канфлікт, пералічылі выпадкі, дзе, калі і колькі разоў хто хрысьціў Спадара. Выпадкаў аказалася даволі шмат.

І пастанавілі:

Лічыць Спадара нядуэлездольным.

Што будзе далей, сказаць трудна. Але, бяручы пад увагу, што на дварэ глыбокая восень, трэба думаць, што навет і Спадар гіляваць пакіне:

Бо холад яго вылячыць. **Picolo.**

пасьмех, як перад гэтым Янку Станкевіча і Каўша ў другіх кірунках. Сама-ж тым часам хавае галаву нібы той страус у пясок. Кажуць, што за выручаныя аб „шулерні“ грошы наша „санацыя“ думае ўжо сама выступіць з выданьнем свайго органу. Бедны Т. Вэрбіцкі і яго „Грамадзянін“! Стараўся-стараўся, каб жыць на сьвеце, а тут нашліся „спрытнейшыя“ і падводзяць міну; Пэўна-ж не ўстаіць!

Значыць, ня трэба быць вялікім прарокам, каб прадбачыць сьмерць і „Грамадзяніна“ і, як кажуць, „Бел. Дня“. Як чутно, то ўжо і Янка ідзе ў расход, бо зашіня ўжо скампраміатаваўся перад народам. як таксама ў апошні час і перад інтэлігенцыяй сваім запраўдзе дзікім абыходжаньнем з вучнямі Гімназіі і студэнтамі!

Папераджаем і нашых „вялікіх“ дзеячаў, што—„ад вялікага да сьмешнага—адзін шаг!“ Не прабіць сялянска-работніцкае справы і вашымі „мудрымі“ галавамі! А „шулерню“ можаце сабе і браць і рабіць з яе культуру. Але нашто псаваць Крука? Ці—не даволі Янкі і Каўша? Вылазьце ўжо самі!

— **Банда з ручным кулямётам.** Апошняя прэса паведамляе, што ў Пастаўскіх лясох паявілася банда, маючая ручны кулямёт.

Складаецца яна быццам з некалькіх дэзэртыраў, пад камандай дэзэртыра з аднаго з віленскіх палкоў нейкага Антуха.

— **Літоўская прэса аб канфіскатах беларускай радыкальнай прэсы.** 19 нумар выходзячага ў Вільні літоўскага 2-хтыднёвіка „Жыцьцё Народу“ зьмяшчае заметку, што „ужо ўсе прывыклі да сыстэматычнага канфіскаваньня органу беларускіх радыкалаў, які ўжо зьмяніў столькі назоваў, што запраўды ня ведама, які яго чародны назоў. Аднак, „Гродзкае Староства“ не пазваляе жартаваць і „Маланцы“, якая таксама дачакалася часьцейшых канфіскатаў. Каб беларусам ня было крыўдна, сканфіскавана на пацеху на каротка „перадмэшня“ „Vilniaus Aidas“. Падаючы гэтую ведамасьць, пашкада нашае рэдакцыя толькі дадумваецца, за што была канфіската“.

— **Календар на 1929 г.** Ужо закончваецца друкаваньне і праз 2 тыдні выйдзе ў сьвет кніжка—Календар Віленскага Т-ва на 1929 г. Фармат кніжкі ў два разы вялікшы, чым у мінулым годзе (11 аркуш.). Кніжка будзе каштаваць прыблізна 1 зл. 50 грош., мо' навет трохі даражэй. зьмест вельмі багаты, складаецца з 12 аддзелаў. У календары зьмешчаны цэлы рад фатаграфій паветовых зьездаў Т-ва Белар. Школы. народных дамоў, драмат. і музык. кружкоў, бібліятэк-чытален і т. д.

У справе заказаў зварочвацца па адрасу: „Wilno, ul. Ostrobramska № 1, księgarnia Białoruska Wydaw. T-wa.

— **Новая партыя асаднікаў.** Міністэрства Земельных Рэформаў прыгатавала надзяленьне зямлёй вайсковых інвалідаў у паветах: Віленска-Троцкім, Ашмянскім, Сьвянцянскім, Браслаўскім, Пастаўскім, Дзісьненскім, Вялейскім Маладзечанскім, Валожынскім і Лідзкім. Гэты праект будзе прадстаўлены далей разгляду і зацьвярджэньня на паседжаньні Рады Міністраў, якое мае адбыцца на гэтым тыдні. Калі гэты праект зацьвердзяць, дык хутка новая хваля асаднікаў паплыве сеяць „культуру“ на нашай зямліцы.

Ну, беларускі селянін напэўна чакае дарагіх госьцікаў!..

памачнікаў ў жыда воз, завязьці іх на збіты [illegible] дамоў, і ў дадатак сказаць п. камандзенту сваё прозьвішча, каб потым заплаціць штраф.

Дуброва.

Двухязыковая школа.

(В. Пагарэлка, Яроміцкая гм., Стаўпецкі пав.).

Два разы падавалі сяляне нашай вёскі дэкларацыі з жаданьнем пераўтварэньня існуючай польскай школы на беларускую. У адказ на жаданьне падаваньня дэкларацыі, далі нам двухязыковую (утраквістычную) школу. Пакуль што застаецца заказаным і грэх: Парадзілы, якое суцэльна будзе ў двухязыковай [illegible]. У пачатку навучальнага [illegible] школьнага году (было гэта перад [illegible]) здавалася будзе добра, [illegible] была беларуская мова, а [illegible]. А вось у гэтым годзе, ужо зусім інакш: [illegible] дзень, а аб беларускай мове ні слуху, ні духу. Але за гэта асаблівая ўвага зьвяртаецца „na pisanie i roboty ręczne“. Кожны вучань павінен мець каля 12 сшыткаў, на якіх амаль нічога не прыходзіцца пісаць; кожны вучань мець некалькі аркушоў каляровай паперкі, клей і інш. усё гэта для работ. [illegible] хадзіць да навукі. Яны [illegible] ўжо месяц [illegible], ні толькі адна літары ня ведаюць, а навет лемантара ў вочы не бачылі і хаця-б польскага! Вось і заходняя культура!

Сяляне павінны вясці далей барацьбу за родную школу, аж пакуль не пераможуць.

Нядоля.

Дзе дзяюцца народныя грошы.

(Маладзечанскі пав.).

Шмат бяруць у нас розных падаткаў. Але трэба паказаць, дзе яны дзяюцца! Дык вось, [illegible] задумалі вясною пасадзіць дрэва на гасьцінцы з м. Лебедзева да м. Маркава. Але, мусіць, доўга думалі, як паказаць „заходнюю культуру“, дык спазьніліся, бо тагды сталі садзіць, як дрэвы пачалі распускацца. Як гэта рабілася, ня варта пісаць, гэта відаць з таго, што прынялося толькі 10 проц., а грошы за ўсе заплочана. Дык вось, дзе дзеюцца народныя грошы. „Нашыя“ ўрадоўцы, замест таго, каб зрабіць у час, наўмысна адцягваюць работу, а тагды ізноў трэба садзіць, а сялянам—падаткі плаціць.

Бедны.

Нам пішуць з вёскі яшчэ, што:

— **У в. Крымна** быў нейкі п. Б. сэкрэтаром гміны, а разам і сэквэстратарам. Езьдзіў ён па вёсках ды апісваў апошнія манаткі ў згалеўшых і так сялян. Але колькі сяляне не плацілі падаткаў, усё-ж не хапала. Вось аднойчы прыяжджае кантроль. Зрабілі рэвізію. Па аблічэньню і праверцы ўсіх падатковых кніжак, аказалася, што перабору было зроблена на некалькі тысяч. Прыйшлося нашаму „дзеячу“ ісьці за краты, але... знайшоўся „панок“, які за яго паручыўся і ён застаўся на волі. Хутка быў вызначаны суд. Зьехалася вельмі шмат сьведак (пакрыўджаныя сяляне). Абвінавачаны вельмі спалохаўся, так што доктар прызнаў яго „псыхічна хворым“. Суд адлажылі; калі будзе наступны—ня ведама.

Камэнтарыяў не патрэбна.

— **У м-ку Моўчадзі**, Баранавіцкага пав., на Усьпеньне поп Моўчадзкае царквы, абляяў сваіх парахвіян за тое, што яны не даюць ахвяр на царкву і накінуўся на тых сялян, якія паслалі ўжо папоўскую „праўду“ і адвярнуліся ад яе. Праз поўгадзіны а. Мікалай пасылаў „пяруны і маланкі“ на не паслушных „авечак“, называючы іх цёмнымі людзьмі, закідваючы ім прыхільнасьць да дзяржавы, у якой не прызнаюць „храма божага“, а „слугаў божых“ як наш айцец, перасьледуюць.

Цікава, што а. Мікалай не назваў дзяржавы, у якой „слугі божыя“ перасьледуюцца! На колькі нам ведама, то гэтых перасьледуюць у Мэксыцы за тое, што яны паўсталі з аружжам у руках, каб адбіць „свае“ маёнткі, якія канфіскавала дзяржаўная ўлада. Але, як можна было судзіць з прамовы, а. Мікалай меў на думцы СССР, аднак, там „слугі божыя“, здаецца, не перасьледуюцца, а толькі пазбаўлены ўрадавай дапамогі, паміраюць собскай сьмерцяй.

„Бязбожнікаў“ ён абвінавачвае ў тым, што яны могуць ашукваць і наагул рабіць розныя „безбожныя дела“. Але калі прагледзіць „цёмныя і яўныя“ „дела“ а. Мікалая, то лепшага „майстра“ хіба ня знойдзеш. Бо хто не шкадуе жывых і мёртвых? — а. Мікалай! Хто ўзяў двайную плату за мэтрыку, а калі ў беднай жанчыны не хапіла да 20 зл. аднаго злотага, дык паслаў пазычаць да жыда,—а. Мікалай! Хто падчас шлюбу за 20-ці грашовую сьвечку бярэць злот?—а. Мікалай і г. д. і г. д.

Ня дзіва, што „авечкі“ перастаюць быць авечкамі і пачынаюць абходзіцца і без айцоў Мікалаяў.

Дзед Мацей.

Закладайце свае, беларускія, каапэратывы.

Каапэрацыя — гэта шлях да перабудовы грамадзкага ладу на новых, больш справядлівых падставах.

Каапэрацыя — гэта адзін з відаў сацыяльнай барацьбы працоўных за лепшую будучыню.

Дык твары каапэрацыю і абмінай прыватнага гандляра, як заразу!

З Радавае Беларусі.

Сярод пісьменьнікаў, паэтаў і літэратараў.

У сьнежні месяцы гэтага году адбудзецца дваццацігодьдзе літаратурнай дзейнасьці Цішкі Гартнага.

Для сьвяткаваньня юбілею пры Наркомасьветы БССР зложана камісія.

— **Якуб Колас** падрыхтаваў да друку другі том сваіх твораў. Першы том хутка выйдзе з друку ў Беларускім Дзяржаўным Выдавецтве. Біяграфічна-крытычны артыкул да збору твораў Я. Коласа напісаў У. Дзяржынскі.

— **З. Жылуновіч** падрыхтаваў да друку зборнік крытычных-артыкулаў аб беларускай літэратуры: „Узгоркі і нізіны“.

— **Тодар Глыбоцкі** здаў Белар. Дзяржаўнаму Выдавецтву зборнік сваіх літэратурна-крытычных нарысаў пад назвай: „Пра літэратурныя справы“.

— **Алесь Гародня** напісаў новую п'есу-сатыру з жыцьця Зах. Беларусі пад назвай: „Пісар пана Куркуса“. Гэты-ж аўтар піша цяпер вялікі артыкул аб клясавай дыфэнцыяцыі ў беларускай літэратуры.

— **Тэатр, мастацтва, музыка.** Другі Беларускі Дзяржаўны Тэатр мае перарабіць для пастаноўкі ў наступным сэзоне апавяданьне Цішкі Гартнага: „Гаспадар“. Сябра Аб'яднаньня пісьменьнікаў „Полымя“ А. Ляжкевіч здаў у Беларускае Дзяржаўнае Кіно сцэнары „Пела вясна“, паводле апавяданьня Якуба Коласа „На прасторах жыцьця“. Хутка пачнуцца здымкі. Далей Ляжкевіч прыступае да апрацоўкі кінэсцэнарыяў, паводле п'есаў Ц. Гартнага: „На стыку“ і „Дзьве сілы“.

— Пісьменьнікам А. Вольным напісаны для Беларускага Дзяржаўнага Кіно сцэнары карціны „Атаман Муха“. Карціна мае быць гатовай к зіме бягучага году. А. Вольны працуе над камэдыяй з беларускага жыцьця, якую таксама набывае Беларускае Дзяржаўнае Кіно для пастаноўкі.

— Калегія Наркомасьветы Канчаткова вырашыла пытаньне аб арганізацыі ў Менску ў гэтым годзе беларускага дзіцячага кіно-тэатру. Апошні будзе знаходзіцца ў памешканьні кіно-тэатру—„Пралетары“. Тэатр будзе трымаць курс на арганізаванага гледача.

— Кіно-камітэт зацьвярдзіў сцэнары: „Пагранічныя слупы“ з жыцьця пагранічных беларускіх вёсак, прадстаўлены трупай маскоўскіх пісьменьнікаў і сцэнарыстых.

— **Далейшая „беларусізацыя ў Рад. Беларусі.** Урад Беларускае Савецкае Рэспублікі пастанавіў рашуча праводзіць далейшую беларусізацыю ўсіх галінаў жыцьця Рэспублікі. Згодна з інфармацыямі прэсы, за няведаньне беларускае мовы толькі ў 2 раёнах (Менскім і Полацкім) будзе зволынена са службы 2,000 ўрадоўцаў.

Паштовая скрынка.

Любчанскаму бедняку. Ня можам зьмясьціць, бо немагчыма прачытаць: надта нявыразна напісана. Напішыце яшчэ раз, але выразна і чарнілам. — **Колі Паслушнаму.** Вашу карэспандэнцыю надрукуем. Пішаце Вы зусім добра, дык прысылайце надалей карэсп. з жыцьця Відзаў і ваколіц. — **Марыі Кароцькай.** Вашыя вершы з папраўкамі надрукуем. Каб больш пашырыць свой талент, трэба, каб Вы чыталі творы беларускіх паэтаў. Спрабуйце пісаць карэспандэнцыі з жыцьця сялян, сярод якіх Вы знаходзіцеся. Наагул, у сваіх творах Вы павінны даваць абраз таго цяжкога і прыгнечанага жыцьця, у якім знаходзіцца працоўная жанчына, ці наагул працоўны народ! Чакаем далейшых Вашых прац!— **Зорваму.** Газэта Вам высылаецца. З карэспандэнцыі скарыстаем.—**Цярплівому.** Пішыце карацей, падаючы найбольш яскравыя факты, з прысланага скарыстаем.—**Агню.** Пішыце на адным боку паперы і карацей. З прысланага скарыстаем. Дзякуем. — **Горкаму.** Пішыце як найкарацей, бо каб зьмяшчаць Вашыя карэспандэнцыі, дык трэба было-б не зьмясьціць цэлы рад артыкулаў.—**Справядліваму, М. Тулю, Т. Разаку, Дуброве, Сымону Зорцы, Прысутнаму.** Ад Вас усіх карэспандэнцыі атрымалі. Агульная просьба: пішыце як найкарацей, бо 1) вельмі шмат ёсьць карэспандэнцыяў; 2) шмат застаецца карэсп. дзякуючы частым канфіскатам нашай газэты. З прысланага скарыстаем. Пішэце і далей.— **Свайму.** Дайце спакой са сваімі карэспандэнцыямі, бо Староста Гродзкі грозіць нашаму Рэдактару за падобныя артыкулы—артыкуламі з кодэксу карнага, а чытачам—канфіскатай газэты. Гэтага нам доўга ня прыходзіцца чакаць.

КАРЭСПАНДЭНЦЫ.

Далоў глупствы!

(В. Дубічы-Царкоўныя, Бельскі павет).

У вёсцы Дубічы-Царкоўныя ў мінулым тыдні пасьля доўгіх запрошаньняў прыехаў „kierownik Stowarzyszenia Spożywców“, дзеля залажэньня каапэратыўнага склепу.

Як даведаліся сяляне аб гэтым, то хутка прышлі і адразу набралася каля 20 сяброў. Шмат яшчэ хто падпісаў-бы дэклярацыі, але на той час ня мелі грошаў, з поваду надыйшоўшых падаткаў. Далей вызначылі скляпоўага. „Kierownik“ апавясьціў, што скляповы чалавек павінен быць адпаведны: добра граматны, бо ня толькі павінен умець зважыць і прадаць, але, апрача таго, весьці культурна-асьветную працу, далей павінен быць сумленны і ня заняты гаспадаркай. Усе сябры аднагалосна ўказалі на жыхара Трахіма Панфілюка. Пасьля Тарас Тамашук пачаў кіраўніку набівацца сваім сынам Васькай, каб выбралі яго скляповым. Асабліва аб гэтым пачаў клапаціцца Павал Анасучук, бо ён сам хацеў быць скляповым, але ведаў добра, што сябры не дапусьцяць яму ўлезьці туды, то ён нашоў сабе сябру.

Так яны і зрабілі — два сябры проці волі ўсіх астальных. Сяляне, пабачыўшы такую няпраўду, абурыліся. Некаторыя з сяброў пачалі забіраць свае складкі назад.

Перад канцом сходу п. „kierownik“ сказаў, што Трахім Панафілюк ня можа быць скляповым „z powodu podejrzania jego w polityce“.

Статут „Stowarzyszenia Spożywców“ аб гэтым нічога ня кажа і выняткаў розных ня мае, але-ж што Статут, як новы скляповы зафундаваў сваім хадатаям абед з гарэлкай.

У такім выпадку гарэлка — не магла пашкодзіць нашаму новаму скляповаму ў яго бабтыстычным пераканеньні. На колькі спачатку жыхары былі заахвоціўшыся за каапэратыўны склеп, то цяпер на столькі зрабіліся апатычнымі, дзякуючы тэй камбінацыі з скляповым. Сорамна нам, браты, глупствам займацца!

Мы ўсе шчыра павінны ўсяцца за арганізацыю каапэратываў, бо ў арганізацыі моц!

Дубіцкі.

Праца нашага каапэратыву.

(В. В.-Кракотка, Слонімскага павету).

З балянсаў нашага каапэратыву відаць, што ў працягу 9 месяцаў каапэратыў зрабіў на 5187 зл. 46 гр. абароту, гэта значыць абярнуў сваім капіталам каля 10 разоў. Вынік такі: у першым годзе можна лічыць за добры. Абліччэньне склепу на 1.X—28 г. выказала чыстага даходу 379.73 зл.

Каапэратыў моцна адчувае недастачу грошай да абароту. Дзякуючы маламу капіталу, каапэратыў змушаны рабіць частыя закупы ў горадзе, што пацягне за сабою вялікшыя затраты часу і грошай.

Аднак, паміма перашкод, якіх каапэратыў мае—дзякуючы недастачы капіталу—каапэратыў разьвіваецца. Сьвядомасьць сярод сялян расьце, як відаць з таго зацікаўленьня, якое выявілася на сходзе сяброў каапэратыву 14-га кастрычніка г. г.

Перад сабою каапэратыў мае шырокае поле дзеяльнасьці. Пакуль што каапэратыў вядзе працу толькі ў галіне спажывецкай. Аднак, на сходзе сяброў 14.X 28 г. сялянесябры вельмі жыва абгаварвалі справу супольнага закупу сельска-гаспадарчых машын і штучных гнаёў да агульнага ўжытку.

Сяляне нарэшце зразумелі карысьць належаньня да каапэратыву. Супольным упорам, высілкамі сябры нарэшце збудуюць свой дабрабыт.

На чале ўправы каапэратыву стаяць энэргічныя і сумленныя людзі, дзейнасьцю іх і ахвярнай працай будучыня каапэратыву забясьпечана.

Сябра каапэратыву.

Трохі і пра Вялейскі Соймік.

Дня 22 траўня г. г. у зьвязку з асабістымі справамі давялося мне быць у Вялейскім магістраце, дзе адбывалася паседжаньне сяброў Вялейскага паветовага сойміку. Парадку дзеннага ўсяго ня помню. Разглядаліся справы ўхваленьня дадатковага бюджэту і выбары сябры ў ваявудзкую раду. Як я бачыў, дык і тут без правіцы і лявіцы не абышлося. Падчас выбараў сябры правіцы выставілі свайго кандыдата, абшарніка Бароўскага, а лявіца—Субача. Правіца стала выстаўляць з лявіцы, каб разьбіць галасы; некатарыя сябры з лявіцы зразумелі хітрасьць правіцы і сталі выстаўляць правіцу, але правіца паздымала з сябе кандыдатуры, пазаставіўшы аднаго п. Бароўскага. Гэтым і разьбіла галасы лявіцы. Гэткім чынам і застаўся выбраны пан Бароўскі. Дык вось, паважаная лявіца, трэба пільна глядзець на справу і сачыць за хітрасьцямі правіцы. Лявіцай быў унесены ўнёсак аб ухваленьні на Беларускія гімназіі 800 зл. Справу гімназіяў высьвятляў Субач, але не абышлося і тут бяз укораў правіцы па адрасу Бел. Гімназіяў. Асабліва пан Бароўскі нападаў на Радашкоўскую Гімназію, што яна „бальшавіцкая“, што з яе ўсе вучні ўцякаюць заграніцу да бальшавікоў вучыцца. Пасьля дыскусіі старш. запрапанаваў галасаваньне з падняцьцем рук, перш за ўхваленьне 800 зл. Лявіца падняла рукі і калі правіца заўважыла, што на лявіцы большасьць, дык правіца не адважылася і крануцца з мейсца, ба ўсё роўна бачыла, што нічога не паможа. Гэткім чынам і было ўхвалена 800 зл. для Віленскай Бел. Гімн. Дык вось, каб у кожным разе так перамагалі, скора-б мы дайшлі да лепшага жыцьця. Справы свае ў магістраце скора залатвіць не ўдалося, прышлося чакаць аж да заканчэньня паседжаньня сойміку, тут я прыглядаўся, як вырашаліся і другія справы. Як відаць па вонкаваму выгляду, дык лявіцы большасьць асаблівая заўважыў падчас абеду, што многія з сябраў пайшлі шукаць, каб дзе зьесьці сялядца, а многа менш папёрла ў клюб ужэднікаў на цяляціну, гусяціну і парасяціну.

Дрыль-унягі.

Як нам жывецца.

(М. Моўчадзь, Баранавіцкі павет).

Паліцыя часта на нашым кірмашы вырабляе „штучкі“!

Гэтак вось 10.X г. г. паліцыянт Моўчадзкага пастарунку п. Рончка ў селяніна з в. Карашкі, Лабора Дзям'яна, калі гэты быў адсутны, выцягнуў воз, запрог каня і кудысьці на ім паехаў.

Калі гаспадар вярнуўся, то яму сказалі, што конь і воз ягоныя арыштаваны. Гаспадар, доўга не чакаючы, пабег да пастарунку.

І вось маеш! Знаходзіць каля пастарунку свой воз у дрэбязгі разьбіты, валяючыся на дарозе, а каня няма, якога толькі пазьней знайшоў у полі за мястам. Там конь апынуўся таму, што паліцыянт прывязаў яго каля пастарунку за плот і калі йшоў аўтамабіль, то конь разам з возам і папаў пад яго. Конь неяк парваўшы ўсю збрую, вырваўся з-пад аўта, а воз разьляцеўся на шчэпкі.

Беднаму селяніну засталася толькі пад пагрозамі каманданта і іншых паліцыянтаў (бо пана Рончкі ня было) сабраць шчэпкі і,

Рэдактар-Выдавец: В. Філіповіч.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.